УДК 726-049.6(=161.3)(470+571)"1772/1917"

*П. А. Каралёў*

# Зберажэнне архітэктуры Беларусі культавага прызначэння часоў Расійскай імперыі (1772–1917)

*На аснове кампаратыўнага аналізу выяўляюцца адносіны грамадства да аховы культавых помнікаў беларускай архітэктуры другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст., якія належалі розным канфесіям. Падкрэсліваецца, што ў часы Расійскай імперыі, дзякуючы падтрымцы пэўных палітычных колаў, галоўная ўвага надавалася праваслаўным помнікам. Гэта ў сваю чаргу не выключала істотных праблем у справе зберажэння праваслаўнай спадчыны. На аб'ектах каталіцкай канфесіі часта праводзіліся мерапрыемствы па іх перабудове, змяненні і нават разбурэнні. Разглядаюцца прычыны і меры, якія прадпрымаліся ў гэты перыяд па зберажэнні/разбурэнні культавых збудаванняў. Актуалізуецца пытанне навуковага вывучэння помнікаў культавай архітэктуры.*

Культавыя помнікі архітэктуры Беларусі на працягу ўсяго XIX – пач. XX ст. займаюць цэнтральнае месца ў вывучэнні і правядзенні ахоўных мерапрыемстваў. Менавіта ў гэты час фарміруецца сістэма аховы культавых аб'ектаў.

Вывучэнне праблемы зберажэння помнікаў розных канфесій вывучалі даследчыкі Т. В. Габрусь, М. Я. Клепікаў, А. М. Кулагін, А. М. Кушнярэвіч, І. М. Слюнькова, М. М. Шчакаціхін [9; 11–13; 21; 23; 24] і інш. Разам з тым дастаткова не асветленым застаецца пытанне непасрэдных адрозненняў падыходаў да помнікаў розных канфесій.

*Мэта артыкула* – паказаць іерархічнае раздзяленне культавых аб'ектаў беларускай архітэктуры ў плане іх захавання ў перыяд Расійскай імперыі.

*Праваслаўныя культавыя помнікі* ў азначаны перыяд становяцца асноўнымі, дзе адбываюцца рамонтныя работы, спробы рэстаўрацыі. Такая велізарная ўвага была выклікана тым значэннем, якое надавалася палітычнымі коламі Расійскай імперыі праваслаўю.

Тэндэнцыя пашырэння праваслаўя адзначана пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі. На думку А. М. Кулагіна, пасля 1772 г. (І падзела Рэчы Паспалітай), рэзка ўзрасло і стала пануючым праваслаўнае будаўніцтва [11]. У XIX і пачатку XX ст. на справу аховы і вывучэння праваслаўных помнікаў моцна ўплывала дзяржаўная ідэалогія Расійскай імперыі, якая прытрымлівалася дактрыны «праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць».

Праблему зберажэння праваслаўных помнікаў належала вырашаць Сіноду Рускай праваслаўнай царквы. Без яго ведама забараняліся перабудова і абнаўленне старажытных цэркваў. Даволі часта ход рэстаўрацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культавых помнікаў, грошы на якія выдаваў Сінод, кантралявала Імператарскае археалагічнае таварыства. Гэты статус быў замацаваны ў 1889 г. 78 артыкулам Устава будаўнічага: «Реставрация монументальных памятников древности производится по предварительному соглашению с Императорской Археологической комиссией и по соглашению с Императорской Академией художеств» [22, с. 139–140]. У другой палове XIX ст. значная ўвага надавалася помнікам культавага дойлідства. Перабудовы/аднаўленні цэркваў, якія з'явіліся да XVIII ст., узгадняліся на вышэйшым узроўні.

У 1850–1860-я гг. у ходзе аднаўленчай дзейнасці ў праваслаўных храмах у значнай ступені пачалі выяўляцца і даследавацца беларускія старажытнасці. П. М. Бацюшкаў, выдавец, апякун Віленскай вучэбнай акругі ў 1868–1869 гг., адзначаў: «В это тяжелое для русского чувства время, служившее предвестником возгоревшегося затем польского мятежа… Государю Императору Александру II благоугодно было обратить внимание на прискорбное состояние православных церквей в имениях польских помещиков и Высочайше повелел: безотлагательно приступить к их поддержке и возобновлению на суммы государственного казначейства, отстранив при этом помещиков-иноверцов от всякого участия» [1, с. 16]. Пасля паўстання 1863–1864 гг. інтарэс улад да праваслаўных помнікаў на беларускіх землях толькі павялічыўся.

Істотнае месца ў справе захавання помнікаў архітэктуры ў канцы XIX – пачатку XX ст. займае рэстаўрацыя адметнасцей, якая паступова становіцца ўсё больш навукова абгрунтаванай. Некаторыя працы па цэласным аднаўленні помнікаў (Барыса-Глебская Каложская царква ў Гродне, Сафійскі сабор у Полацку) не праводзіліся на падставе недахопу звестак пра іх першапачатковы выгляд (іх замянілі мэтанакіраванымі рамонтнымі работамі).

Тым не менш у часы Расійскай імперыі існавала нямала выпадкаў самастойнага аднаўлення старажытных цэркваў з боку мясцовых прыходаў, што выклікала незадаволенасць навуковых арганізацый, якія адказвалі за ахову помнікаў.

У часы кіравання Паўла I (і пазней – пры Аляксандры I) надавалася ўвага *рымска-каталіцкім старажытнасцям*, стану іх захавання. Часам выдзяляліся грошы на завяршэнне рамонту той ці іншай святыні (напрыклад, кафедральнага касцёла ў Вільні, дамініканскага кляштара ў Мінску і інш.).

Пры імператары Мікалаю I (1825–1855) адбыўся націск на Рымска-каталіцкі касцёл і ўніяцкую царкву, што паслужыла прычынай аб'яднання новадалучаных тэрыторый з астатнімі мясцовасцямі імперыі. Згодна з распараджэннем імператара (1826) каталікам забаранялася будаваць капліцы там, дзе большасць насельніцтва складалі праваслаўныя [2, с. 54–55].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паўстанне 1830–1831 гг. не прынесла жаданых вынікаў яго удзельнікам, у выніку яго задушэння шырэй распаўсюдзілася праваслаўе. Прычым, пераважна за кошт каталіцкіх храмаў і манастыроў. Па прычыне некамплектнасці многія манастыры перадаваліся на «общеполезные заведения» (бальніцы і інш.). Праваслаўная царква, па выказванні обер-пракурора П. С. Мяшчэрскага, «…для нужд православных церквей и зданий монастырских, ненужных более для католического исповедания», скарыстала гэтую магчымасць для перадачы каталіцкіх святынь у царкоўнае ведамства [15]. Апроч таго, у красавіку 1839 г. на аснове найвышэй зацверджанага палажэння многія былыя манастырскія і канфіскаваныя будынкі былі перададзены ваеннаму ведамству. Утрыманне гэтых памяшканняў у належным стане было прызначана імператарам «на счёт края» (г. зн. мясцовых улад) [4].

Становішча каталіцкай канфесіі пасля паўстання 1863 г. значна пагоршылася – многія касцёлы разбураліся, зачыняліся, пераабсталёўваліся пад праваслаўныя цэрквы. Напрыклад, адзін з найстарэйшых каталіцкіх храмаў Беларусі – касцёл Праабражэння Гасподняга ў Навагрудку (XIV ст.), закрыты пасля паўстання ў 1864 г., з цягам часу разбураўся (рэканструяваны ў пачатку XX ст.). Прычыны для закрыцця каталіцкіх храмаў маглі быць розныя. Напрыклад, капліца ў в. Сар'я (Верхнядзвінскі р-н) была перададзена ў 1865 г. праваслаўным вернікам «па прычыне яе прыгажосці» [18, с. 136].

Працэс «паўторнай рэканструкцыі» былых касцёлаў быў распачаты з мэтай іх большага набліжэння да помнікаў праваслаўнага характару. Двойчы «исправлялся» касцёл езуітаў у Полацку, кафедральны сабор у Мінску. Неаднаразова змяняўся выгляд Сафійскага сабора ў Гродне (былы касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі) [21, с. 210, 214]. Ранейшае зберажэнне форм каталіцкіх святынь выглядала недастатковым. Патрабаваліся больш радыкальныя рэканструкцыі.

Нямала заставалася разрабаваных і запушчаных храмаў. У некаторых выпадках дзяржаўныя чыноўнікі разумелі, што паўразбураныя манастырскія будынкі выклікаюць у рымска-каталіцкага насельніцтва адмоўнае ўражанне, «растравляя своим видом непрерывно раны» [9, с. 39–40]. Таму манастыры стараліся прыстасаваць пад розныя гаспадарчыя патрэбы.

Разам з тым адбываліся працэсы вывучэння каталіцкай спадчыны з мэтай яе далейшай аховы. Напрыклад, Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі даслала да ксяндзоў Мінскай губерні асобны запыт ад 20.09.1843 г., каб атрымаць ад іх звесткі пра касцёлы і кляштары, «о времени их построения и их достопримечательностях» [19].

Ахова помнікаў каталіцкай канфесіі адносна паспяхова была рэалізаваная на практыцы ў пачатку XX ст., калі за зберажэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ектаў адказвалі Імператарская археалагічная камісія, Імператарскае Маскоўскае археалагічнае таварыства і інш.

*Уніяцкія помнікі* – культавыя будынкі, заснаваныя ўніяцкай царквой пасля падпісання Берасцейскай уніі (1596) або пабудаваныя раней ці перароблены пасля перадачы іх грэкам-каталікам. Варта адзначыць, што ў канцы XVIII ст. большасць беларускага насельніцтва складалі ўніяты (сярод сельскага насельніцтва – амаль 80 %) [14, с. 584]. Пасля 1772 г. праваслаўнае будаўніцтва стала пануючым. Але пры гэтым у адносінах да каталіцкай і ўніяцкай царквы праводзілася асцярожная палітыка: было дазволена выконваць каталіцкія абрады, маёмасць касцёлаў і кляштараў заставалася недатыкальнай. Вядома, што ў час царавання Павел I (1796–1801) не падтрымліваў уніятаў, таму некаторыя ўніяцкія храмы былі пераўтвораны ў касцёлы або перадаваліся пратэстантам [6, с. 334]. Царская палітыка ў дачыненні ўніяцкай царквы была накіравана на звужэнне сферы яе ўплыву, рэфармаванне з мэтай збліжэння з Рускай праваслаўнай царквою і, урэшце, знішчэнне. Напрыклад, у 1798 г. драўляную ўніяцкую царкву Успення Прасвятой Багародзіцы ў Мінску (у замку), «оставшуюся без прихожан <...> и от времени приходящую в ветхость», перадалі Мінскаму лютэранскаму таварыству (па прашэнні дадзенага таварыства). У канчатковай рэзалюцыі адзначалася: «Губернское правление <…> отдаче <…> препятствий не находит» [5].

У выніку ваенных сутычак падчас паўстання 1830–1831 гг., што адмоўна паўплывала на захаванне архітэктурнай спадчыны краю, культавыя будынкі разбураліся. А некаторыя помнікі архітэктуры падчас вайны пераабсталёўваліся ўрадам Расійскай імперыі пад шпіталі, турмы і інш. Так, мінскі жаночы манастыр базыльянак выкарыстоўваўся для ўтрымання ваеннапалонных. Ігумення манастыра Праскоўя Ляўшыцкая не раз звяртала ўвагу вышэйшых улад на псаванне будынкаў. Аднак яе звароты засталіся без увагі. Праўда, у рэшце рэшт ваеннапалонныя з манастыра былі выселены, але ён так і не быў належна адрамантаваны [16]. Такіх выпадкаў з прыстасаваннем культавых аб'ектаў пад розныя патрэбы было шмат.

Пасля 1831 г. пачалося наступства з боку ўрада Расійскай імперыі на ўніяцкую царкву. У 1835 г. быў заснаваны Сакрэтны камітэт па яе справах, а ў 1839 г. рашэннем Полацкага царкоўнага сабора адбылося аб'яднанне з праваслаўнай царквою. Шматлікія ўніяцкія храмы былі зачынены або перададзены праваслаўным вернікам.

У канцы 1830-х гг. Беларуская кансісторыя па прапанове мітрапаліта І. Булгака прадпісала ўніяцкаму духавенству прыбраць амбоны, бакавыя прастолы ў далучаных да праваслаўя цэрквах. Царкоўныя арганы ўказам Літоўскай кансісторыі ад 02.05.1838 г. было загадана пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дацьс, а атрыманыя грошы накіраваць на кананічнае абсталяванне праваслаўных цэркваў [12, с. 65]. Разам з тым, як адзначаў даследчык пачатку ХХ ст. П. Красавіцкі, царкоўныя дзеячы Іосіф Сямашка, Васіль Лужынскі, Антоній Зубко стараліся не выклікаць балючых перамен, а праводзілі дзейнасць «...с мудрой постепенностью и с умением отличать существенное от несущественного» [10, с. 39]. Пра гэта сведчылі амбоны, бакавыя каталіцкія алтары, якія працягвалі заставацца ў многіх былых уніяцкіх і каталіцкіх храмах.

Тым не менш у гэты перыяд каталіцкія касцёлы і былыя ўніяцкія цэрквы перабудоўваліся, падаўлялася ўніяцкая традыцыя.

З утрыманнем шматлікіх хатніх цэркваў, капліц і невялікіх прыпісных храмаў, якіх было шмат на беларускіх землях, існавала асобная праблема. У новых умовах пасля далучэння да Расійскай імперыі, улады краіны стараліся высветліць, наколькі неабходна было іх зберагаць. Каталіцкія і ўніяцкія храмы і капліцы былі не характэрныя праваслаўнай традыцыі, таму іх захаванне не з'яўлялася прыярытэтным. У гэтым сэнсе паказальны рапарт магілёўскага епіскапа Анастасія ад 08.02.1801 г. у св. Сінод: «В здешнем крае, кроме домовых, много находится, особливо в обращенных из унии приходах по деревням, приписных к приходским церквей и каплиц, или так называемых часовен, кои хотя по большей части состоят праздны, но если начать упразднять оные, может из сего выйти роптание» [3, с. 14]. І ў другім лісце (ад 10.09.1801 г.) ён працягваў: «Прочие приписные церкви и каплицы, хотя не должны существовать, но во уважение привязоности к сему тех мест жителей <...> надобно, кажется, оставить их на прежнем своем положении, до совершенного их само по себе чрез обветшалость упразднения и тогда снесения» [Там жа]. Капліцы не пералічваліся ва ўказе Мікалая І па зборы звестак пра старажытнасці (1826), а таксама ў іншых указах. Толькі бліжэй да канца ХІХ – пачатку ХХ ст. яны сталі ўспрымацца як помнікі, якім неабходна ахова.

Культавыя будынкі іншых канфесій (мячэці, сінагогі) у часы Расійскай імперыі таксама мелі магчымасць станавіцца помнікамі старажытнасці, якім належала ахова. Разам з тым такіх выпадкаў амаль не зафіксавана ў параўнанні з хрысціянскімі святынямі. 4 ліпеня 1822 г. Камітэтам міністраў была прынята пастанова «О средствах к сохранению достопамятностей Тавриды», дзе да помнікаў былі аднесены мячэці, старыя лазні, крэпасці. Аднак палажэнне ахоўвала ў першую чаргу помнікі Крыма, а аб'екты на беларускіх землях заставаліся па-за ўвагай.

Разам з тым у пачатку ХХ ст. асобныя пабудовы пачынаюць успрымацца як помнікі, якім належыць ахова. Так, напрыклад, Магілёўскі губернскі статыстычны камітэт для «Альбома фотографических снимков старины Могилёвской губернии», што павінен быў выйсці перад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першай сусветнай вайной, сярод іншых помнікаў прыняў рашэнне змясціць выявы Быхаўскай сінагогі, сінагогі ў Шклове і інш. [20].

Такім чынам, на працягу існавання імперыі расійскі ўрад у вырашэнні практычных задач унутранай палітыкі надаваў важную ролю праваслаўнай царкве. Захаванне яе помнікаў павінна было садзейнічаць давядзенню спрадвечнага «истинно-русского характера культуры западного края» [24, с. 4]. Відавочцы і непасрэдныя ўдзельнікі тых падзей адзначалі: «На судьбе русских древностей отчетливо отражается отношение двух борющихся в крае народностей – русской и польской» [8, с. 1].

Аб'ектам каталіцкай канфесіі, наадварот, надавалася недастаткова ўвагі, а часам праводзіліся мерапрыемствы па іх перабудове, змяненні і разбурэнні. З-за палітычных прычын многія касцёлы пераўтварыліся ў праваслаўныя цэрквы, змянілася іх архітэктура: напрыклад, касцёл Св. Мікалая ў мястэчку Мір (Карэліцкі раён); касцёл у в. Грынявічы (Свіслацкі раён) і іншыя аб'екты.

Што датычыць навуковага падыходу, то каталіцкія святыні разглядаліся не з пункту гледжання палітыкі (як шкодныя ў справе русіфікацыі краю), а з пазіцый архітэктурнай і мастацкай каштоўнасці. У навуковых колах Расійскай імперыі былі і прыхільнікі каталіцкай спадчыны, што захавалася на беларускіх землях. Напрыклад, ІМАТ (Імператарскае Маскоўскае археалагічнае таварыства) заступалася за кляштары дамініканцаў у Друі і кармелітаў у Гродне. Абодва будынкі выклікалі цікавасць як помнікі архітэктуры XVIII ст. Зачыненыя з часоў паўстанняў, яны ў канцы XIX – пачатку XX ст. пачалі разбірацца на цэглу. На жаль, не дапамаглі звароты таварыства да губернскіх начальнікаў, заклікі «прекратить варварство», «принять меры к сохранению интересного памятника старины» [7, с. 77; 17, с. 24].

Варта адзначыць, што ў цэлым крытэрыі вывучэння і захавання помнікаў архітэктуры Беларусі рэалізоўваліся ў агульнаеўрапейскім кантэксце (стварэнне ўстановы па наглядзе за аховай помнікаў, класіфікацыя помнікаў, навукова-абгрунтаваны рамонт аб'ектаў, увядзенне заканадаўчых актаў па ахове помнікаў). Праўда, не ўсе ініцыятывы паспелі належна рэалізавацца да 1917 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края: изданная П. Н. Батюшковым в 1890 г. книга посвящена церковной, военной и политической истории Беларуси с древнейших времен до XIX в. / ред. Т. Е. Янчук. – Минск : БГУ, 2004. – 407 с.

*2. Брыгадзін, П. І.* Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. – 656 с.

*3. Горючко, П. С.* Материалы для истории церквей Белоруссии конца XVIII и начала XIX столетий ; Материалы для истории Могилевского архиерейского хора 1798–1805 гг. / П. С. Горючко. – Могилев : Тип. Губ. правления, 1903. – 42 с.

*4.* Дело ассигновании денег на ремонт подуховных и конфискованных зданий, переданных в военное ведомство // Нац. гіст. архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 (Минское губернское правление). Воп. 5. Спр. 204. Арк. 2.

*5.* Дело по прошению минского лютеранского общества об отдаче ему пустующего здания униатской церкви (12 июля – 9 октября 1798 г.) // Нац. гіст. архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 299 (Минское губернское правление). Воп. 2. Спр. 22. Арк. 5.

*6. Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 679 с.

*7.* Древности. Труды комиссии по сохранению древних памятников Императорского Московского археологического общества : в 6 т. / под ред. И. П. Машкова. – М. : [Б. и.], 1912. – Т. 4. – 321 с.

*8.* Замечательности Северо-Западного края. – Вильна : Виленский учеб. округ, 1868. – Вып. 1. – 29 с.

*9. Клепиков, Н. Е.* Культурно-историческое наследие Беларуси периода Российской империи / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр БГУ, 2008. – 175 с.

*10. Красавицкий, П. М.* Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение : докл. в Витеб. учен. арх. комис. / П. М. Красавицкий. – Витебск : Тип. М. Б. Неймана, 1911. – Кн. 1. – 64 с.

*11. Кулагін, А. М.* Храмы на Дзвіне / А. М. Кулагін // Беларус. гіст. часопіс. – 1993. – № 1. – С. 51–58.

*12. Кулагін, А. М.* Эклектыка: Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А. М. Кулагін. – Мінск : Ураджай, 2000. – 304 с.

*13. Кушнярэвіч, А. М.* Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст.: гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 150 с.

*14. Марозава, С.* Уніяцкая царква на Беларусі / Святлана Марозава, Алена Філатава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 583–586.

*15.* Об упразднённых римско-католических монастырях (1832) // Рос. гос. ист. архив (РГИА). – Ф. 797 (Канцелярия обер-прокурора Синода). Оп. 4. Д. 15765. Л. 12, об. 14.

*16.* О занятии Минского монастыря базилианок военнопленными и о починке зданий оного // Рос. гос. ист. архив (РГИА). – Ф. 797 (Канцелярия обер-прокурора Синода). Оп. 6. Д. 22813. Л. 1, 2.

*17.* Протоколы заседаний Императорского Московского археологического общества за 1903–1904 гг. // Древности. Труды Московского археологического общества / под ред. В. К. Трутовского. – М., 1907. – Т. XXI, вып. 2. – С. 1–74.

*18. Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі / А. Ф. Самусік. – Мінск : БДЭУ, 2004. – 209 с.

*19.* Сведения о древних зданиях и сооружениях в Минской губернии // Нац. гіст. архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295 (Канцылярыя мінскага губернатара). Воп. 1. Спр. 609. Арк. 70.

*20.* Сведения о памятниках старины по Могилёвской губернии (1912–1915) // Нац. гіст. архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2187 (Магілёўскі губернскі статыстычны камітэт). Воп. 1. Спр. 78. Арк. 3.

*21. Слюнькова, И. Н.* Храмы и монастыри Беларуси XIX века в составе Российской империи: пересоздание наследия / И. Н. Слюнькова ; Рос. акад. художеств, Науч.-исслед. ин-т теории и истории изобразительных искусств. – М. : Прогресс-Традиция, 2010. – 616 с.

*22.* Сохранение памятников церковной старины в России XVIII – начала XX в. : сб. докл. / Гос. науч.-исслед. ин-т реставрации ; В. С. Дедюхина [и др.] ; вступ. ст. В. С. Дедюхиной. – М. : Отечество, 1997. – 396 с.

*23.* Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь [і інш.]. – Мінск : Полымя, 1998. – 351 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*24. Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / Мікола Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 330 с.

*P. Karalyov*

**Preservation of cult architecture in the Belarusian lands during the Russian Empire (1772–1917)**

*The article reveals the attitude of the society to the protection of the cult monuments of the Belarusian architecture of the second half of the XVIII – first half of the XIX century, which belonged to different denominations on the basis of the comparative analysis. It is emphasized that during the Russian Empire, thanks to the support of certain political circles, the main attention was paid to Orthodox monuments. This, in turn, did not rule out significant problems in preserving the Orthodox heritage. Catholic dwellings were often rebuilt, altered, and even destroyed. The author considers the reasons and measures taken during this period for the preservation / destruction of religious buildings. In the article updates the question of scientific study of monuments of cult architecture.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 05.10.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ